ISSN 0203 — 2031

# АiВ

# АДУКАЦЫЯ і ВЫХАВАННЕ

11'98



У нумары:

Параўнальная адукацыя (падборка артыкулаў)

Даследчыя ўменні вучняў: дыдактыка і вопыт

Этнапедагогіка ў сістэме педагагічнай культуры

Праблемы рэалізацыі індывідуальна-тыпалагічнага падыходу да студэнтаў ВНУ



# Этнапедагогіка ў сістэме педагагічнай культуры

**В.С.Болбас**, *кандыдат педагагічных навук, загадчык кафедры педагогікі Мазырскага дзяржаўнага педінстытута*

Гісторыя педагогікі сведчыць, што з часоў узнікнення выхавання як грамадска неабходнай з'явы бесперапынна робяцца захады па яго ўдасканаленні. Паступова з перарастаннем поглядаў і ідэй у навуковую тэорыю такія намаганні яшчэ больш узмацняюцца. Каштоўнасць асноватворных вывадаў педагагічнай навукі якраз і вымяраецца грунтоўнай іх праверкай шматвяковым выхаваўчым вопытам. Наогул, развіццё адукацыі адбываецца не толькі і не столькі за кошт інавацый, а ў большай ступені шляхам падтрымкі традыцый пры развіцці іх зместу праз унутранае самаабнаўленне. Інавацыйныя ж працэсы выступаюць у якасці фактараў, якія актывізуюць і стымулююць такое самаабнаўленне і самаўдасканаленне.

Педагогіка, як ніякая іншая навука, мае магчымасць пры дэклараванні любых інавацый побач з іх эксперыментальнай апрабацыяй зазірнуць для параўнання ў скарбонку народнавыхаваўчай мудрасці і ўжо на ўзроўні рацыяналістычнага асэнсавання даць папярэднюю пэўную ацэнку. Не выпадкова, што і ў апошні час у сувязі з перабудоўчымі працэсамі грамадскага ўладкавання, а таксама з-за невысокай эфектыўнасці спецыяльна арганізаваных выхаваўчых працэсаў цікавасць да народнай педагагічнай спадчыны перажывае надзвычай высокі ўздым.

З другога боку, этнапедагагічныя веды павінны аказаць істотную дапамогу ў фармаванні нацыянальнай самасвядомасці падрастаючых пакаленняў, у стварэнні імунітэту супраць бездухоўнасці, нацыянальнага нігілізму і гістарычнага бяспамяцтва, у асэнсаванні кожным выхаванцам сваёй грамадзянскай ролі спадчынніка народных духоўных і матэрыяльных каштоўнасцей.

Гісторыя таксама даказвае, што ў пераломныя моманты жыцця грамадства, калі разбуральныя, раз'яднальныя працэсы прэвалююць над стваральнымі, аб'яднальнымі, на першы план вылучаюцца нацыянальныя

пытанні. Звычайна праз кансалідацыю пэўнай людской супольнасці лягчэй прыйсці да кансалідацыі грамадства ўвогуле.

Ідэалогія савецкага перыяду спрабавала пераканаць, што з развіццём цывілізацыі непазбежна адбудзецца уніфікацыя этнічных культур. Пэўныя тэндэнцыі сапраўды назіраліся, але знешняе ўмяшанне ў працэсы этнагенезу, які валодае велізарным патэнцыялам унутранай дынамікі і самаарганізацыі, спарадзіла на прасторах былога СССР катастрафічныя вынікі. Спробы арганізацыі штучных асімілятыўна-культурных працэсаў з мэтай аб'ядначаць народы ў нейкую новую супольнасць з адначасовым "сціраннем" этнанацыянальных асаблівасцей прывялі да зусім адваротнага. Сёння назіраецца сапраўдны "этнічны рэнесанс", што, з аднаго боку, садзейнічае жыццесцвярджальнаму абуджэнню нацыянальнай самасвядомасці, а з другога — прымае нярэдка выродлівыя, пачварныя формы, якія выліваюцца нават у нацыянальныя канфлікты.

Асэнсаванне такога феномена непазбежна запатрабуе аксеалагічнага падыходу ў аналізе ўзаемасувязі этнічнай і планетарнай культур. У шырокім спектры ўзаемаўздзеянняў этнакультур і агульных накірункаў развіцця цывілізацыі, апроч усяго іншага, этнасу належыць рашаючая роля ў адаптацыі індывіда да інтэнсіўных перамен, якія характэрны для грамадстваў пераходнага тыпу. Вось чаму цікавасць да этнапедагагічнай культуры павінна быць скіравана ў рэчышча актывізацыі далучэння да сусветнай культуры з апорай на нацыянальна-рэгіянальны кампанент. Сёння ўжо аксіёмай гучыць сцвярджэнне аб тым, што ўключэнне ў сусветную, агульначалавечую, планетарную культуру неабходна пачынаць са спасціжэння ўласных этнанацыянальных культурных набыткаў. Развіццё нацыянальнай адукацыі таксама павінна грунтавацца на этнакультурнай ідэнтыфікацыі і інтэграцыі ў сусветную супольнасць.

Апора на нацыянальна-рэгіянальны кампанент дапаможа таксама забяспечыць эфектыўнасць усяму выхаваўчаму працэсу. На неабходнасць арганізацыі выхавання з улікам мясцовых умоў, асаблівасцей духоўнага жыцця грамадства ўказвалі многія вялікія педагогі. "Настаўнік нямецкіх настаўнікаў" Адольф Дыстэрвег адным з першых тэарэтычна абгрунтаваў прынцып культуразгоднасці выхавання, які вынікае з таго, што ў розныя перыяды розныя народы маюць розныя сістэмы выхавання. На вялікую ролю нацыянальнага выхавання ў фармаванні асобы ўказвалі беларускія і рускія асветнікі С.Будны, В.Цяпінскі, Л.М.Талстой, В.І.Вадавозаў, А.Я.Багдановіч і інш. Іх ідэі падводзяць да высновы, што сфармаваць грамадзянскую і патрыятычную свядомасць магчыма толькі на аснове духоўных пачаткаў нацыянальнай культуры. Аддаць справу выхавання падрастаючых пакаленняў самому народу заклікаў К.Дз.Ушынскі. Менавіта ён ушчыльную падышоў да асэнсавання неабходнасці спецыяльнага вывучэння шматвяковага выхаваўчага вопыту народа дзеля павышэння эфектыўнасці педагагічнай навукі і практыкі.

Кожны этнас і кожная нацыя маюць уласную імпліцытную канцэпцыю выхавання, якая адлюстроўвае адметнасць умоў жыцця і менталітэтаў адпаведных гістарычных людскіх супольнасцей. Таму не можа выклікаць сумненняў тое, што распрацаваць адзіную універсальную тэорыю выхавання для ўсіх этнасаў не-

магчыма. З гэтай нагоды К.Дз. Ушынскі пісаў: "Выхаванне, створанае самім народам і заснаванае на народных пачатках, мае тую выхаваўчую сілу, якой няма і ў самых лепшых сістэмах, заснаваных на абстрактных ідэях або запазычаных у другога народа" [1, *161*].

У пераліку складанасцей і цяжкасцей на шляху распрацоўкі тэарэтычных асноў выхаваўчага працэсу ў якасці першарадных можна назваць неадназначнасць, часам палярнасць падыходаў у вызначэнні самога паняцця "этнапедагогіка" і месца апошняй у сістэме педагагічнай культуры і культуры наогул. У значнай ступені задача ўскладняецца спробай размежаваць паняцці "этнапедагогіка" і "народная педагогіка". Менавіта на гэтым, у прыватнасці, засяроджвае ўвагу прафесар В.А.Салееў у манаграфічнай працы "Этнапедагогіка і эстэтычнае развіццё асобы" (1994) і артыкуле "Этнапедагогіка, ці народная педагогіка" ("Адукацыя і выхаванне". — 1996. — № 5).

Навуковае асэнсаванне і дэталёвае вывучэнне народна-выхаваўчага вопыту і народна-педагагічных ідэй ва ўсходніх славян пачынаюцца толькі ў XIX ст. Вывучэнне часцей за ўсё праводзілася ў рамках этнаграфічных даследаванняў. Дасягненні этналогіі дапамагаюць зразумець ролю і месца народна-педагагічных ідэй у сістэме культуры этнасу, а таксама іх адметнасць ад набыткаў іншых этнакультур. Вось чаму пры даследаванні праблем традыцыйна-бытавой педагагічнай культуры трэба мець на ўвазе, што этналогія выконвае дзве найважнейшыя функцыі: як метадалагічная аснова і як эмпірычны базіс вывучэння этнапедагагічнай культуры. Сама ж традыцыйна-бытавая педагагічная культура з'яўляецца такім чынам аб'ектам даследавання як для этналогіі, так і для педагогікі.

Спецыяльнаму і непасрэднаму вывучэнню народна-педагагічнай культуры адным з першых у СССР прысвяціў сваё даследаванне этнограф Г.С.Вінаградаў. У 1926 г. у Іркуцку выходзіць яго кніга "Народная педагогіка". Вучоны вызначае народную педагогіку як "сукупнасць і ўзаемадзеянне народных уяўленняў, поглядаў на жыццё, на выхаванне і навучанне новых пакаленняў, мэты і задачы выхавання і навучання іх, сродкі і шляхі ўздзеяння на юныя пакаленні" [2, *7*].

Задумку Г.С.Вінаградава прадоўжыў І.Я.Пазднееў, дзякуючы намаганням якога ў 1929 г. з'яўляецца на свет падобная праца па даследаванні народнай педагогікі. У трактоўцы гэтага вучонага народная педагогіка таксама разглядаецца як традыцыйная педагагічная думка і традыцыйнае выхаванне пэўнай этнічнай супольнасці.

У 30—40-ыя гг. з-за адпаведнай палітычнай сітуацыі ў краіне практычна прыпыняюцца даследаванні этнапедагагічнага накірунку. У 50—60-ыя гг. узнаўляюцца работы па вывучэнні народна-педагагічнай культуры этнічных супольнасцей Расіі, сярэднеазіяцкіх рэспублік, Казахстана, Украіны і іншых рэгіёнаў СССР. Народная педагогіка ў асноўным разглядаецца ў сацыялагічным аспекце. Класавы падыход паглынае яе этнічную спецыфіку. Прычым да сярэдзіны 60-ых гг. вучоныя пад народнай педагогікай разумелі ў асноўным народна-педагагічную думку, ідэі. А.Ш.Гашымаў вызначаў гэтае паняцце як "народную мудрасць аб выхаванні" [3, *8*], Ю.К.Намітокаў — як "выказванні народа аб выхаванні" [4, *52*]. Падобных падыходаў прытрымліваліся М.Ш.Шырбаеў, В.Ф.Афанасьеў, В.Х.Аруцюнян, М.Б.Гурсуеў і інш.

Паступова ў навуковы ўжытак усё шырэй уводзіцца разуменне народнай педагогікі як сукупнасці педагагічных ідэй і выхаваўчай практыкі. Так, Я.І.Ханбікаў у “Педагагічнай энцыклапедыі” народную педагогіку прапануе разглядаць як “сферу эмпірычных педагагічных ведаў і вопыту народных мас” [2, *12*]. У 70-ыя гг. пачынаецца якасна новы этап па даследаванні народна-педагагічнай творчасці. Назіраецца ўзмацненне этнаграфічнага ўплыву на вывучэнне народнай педагогікі. У 1974 г. прафесар Г.Н.Волкаў выдае грунтоўную працу “Этнапедагогіка”. Тэрмін “этнапедагогіка” ён прапанаваў на 10 гадоў раней, калі абагульняў вопыт этнапедагогікі чувашскага народа. У згаданай жа манаграфіі даследчык спрабуе размежаваць паняцці “народная педагогіка” і “этнапедагогіка”. І хаця ім не даюцца дакладныя дэфініцыі, але досыць выразна вызначаюцца гэтыя паняцці:

“Народная педагогіка — гэта сукупнасць педагагічных звестак і выхаваўчага вопыту, што захаваліся ў вуснай народнай творчасці, звычаях, абрадах, дзіцячых гульнях і цацках і г.д.” [5, *7*].

“Этнапедагогіка — навука аб вопыце народных мас па выхаванні падрастаючага пакалення, аб іх педагагічных поглядах, навука аб педагогіцы быту, аб педагогіцы сям’і, роду, племя, народнасці і нацыі” [5, *30—31*].

Самога аўтара не зусім задавальняе такое размежаванне, і ён робіць агаворку, што “тэрмінам “народная педагогіка” можна, вядома, абазначыць і галіну навукі, што вывучае педагагічныя веды і вопыт народа...” [5, *8*], хаця другі варыянт, на яго думку, мае шэраг пераваг.

У даследаваннях вучонага акцэнтуецца ўвага на этнаграфічным аспекце народна-педагагічнай культуры. Ён разумее, што сацыялагічны падыход не зможа дакладна раскрыць спецыфіку выхавання пэўнай этнічнай супольнасці. Працоўныя масы з’яўляюцца хоць і асноўнымі, але ж не адзінымі стваральнікамі этнічнай культуры. Таму Г.Н.Волкаў раіць уключаць у этнапедагогіку “крытычны аналіз педагогікі варожых працоўным сацыяльных груп і слаёў” [5, *8*].

Тэрмін “этнапедагогіка”, які прапанаваў Г.Н.Волкаў, атрымаў шырокае распаўсюджанне, прычым многія навукоўцы атаясамліваюць яго з тэрмінам “народная педагогіка”. Адна з нешматлікіх спроб развядзення гэтых паняццяў належыць Г.А.Камаровай. Яна спрабуе даць вызначэнне “этнапедагогікі як навукі, якая раскрывае заканамернасці працэсу сацыялізацыі асобы, і акцэнтуе сваю ўвагу асабліва на этнічнай спецыфіцы гэтага працэсу ў розных грамадствах і культурах” [6, *212*]. Пад народнай педагогікай, на думку вучонага, трэба “разумець навуку аб народным выхаванні маладога пакалення”. Аўтар хоча пераканаць, што паняцце “этнапедагогіка” больш шырокае, чым “народная педагогіка”, бо яна вывучае ўсю “сістэму сацыялізацыі” асобы, у той час як прадмет вывучэння народнай педагогікі — працэс выхавання. А ён — толькі пэўная састаўная частка гэтай сістэмы.

Аналіз названых і іншых аналагічных прац прыводзіць да высновы, што на сучасны момант навукоўцамі краін СНД тэрмін “народная педагогіка” тлумачыцца як:

а) сукупнасць педагагічных поглядаў, ідэй, эмпірычных ведаў, уласцівых народным масам (Г.Н.Волкаў, Ю.А.Рудзь, Е.І.Севаўка, В.Ф.Афанасьеў, С.Д.Бабішын і інш.);

б) шматвяковы народна-выхаваўчы вопыт, ці народна-выхаваўчая практыка (Б.Бальжыеў, М.А.Дзібіраў,

Э.Х.Галаеў, З.Васільцова і інш.);

в) сінтэз народна-педагагічнай думкі, эмпірычных народна-педагагічных ведаў і выхаваўчай народнай практыкі (Г.С.Вінаградаў, І.Я.Пазднееў, К.Пірліеў, А.Ф.Хінтыбідзе і інш.);

г) навука аб народным выхаванні (Я.І.Ханбікаў, Р.А.Дэалаеў, Х.Х.Калікаў і інш.).

Паняцце "этнапедагогіка", у сваю чаргу, альбо атаясамліваецца з паняццем "народная педагогіка", альбо вызначае навуку, якая вывучае народную педагогіку. Трэба адзначыць, што існуюць таксама розныя падыходы да спосабу раскрыцця гэтых паняццяў. Адны імкнуцца сфармуляваць адпаведныя дэфініцыі, другія спрабуюць даць апісанне складальных элементаў, трэція намагаюцца прадставіць гэтыя феномены ў выглядзе адпаведных канцэпцый.

Шматлікасць падыходаў у вызначэнні сутнасці паняццяў "народная педагогіка" і "этнапедагогіка" паказвае, наколькі складаная гэта праблема, і схіляе да думкі аб немагчымасці яе адназначнага выражэння. Досыць упэўнена можна канстатаваць, што **сэнс дадзеных катэгорый можа істотна мяняцца ў залежнасці ад канкрэтнага кантэксту**. І гэта нельга назваць неардынарнай сітуацыяй, бо нярэдка адны і тыя ж тэрміны адносяцца да розных прадметаў. Відавочна таксама і тое, што разнастайнасць трактовак тэрмінаў з'яўляецца паказчыкам развіцця навукі. Тэрміналагічнае афармленне паняццяў, якія адлюстроўваюць сутнасць прадмета даследавання, садзейнічае фармаванню канцэптуальных ведаў. Адбываецца яно паступова, і на сучасным этапе даследавання этнапедагагічнай культуры адзначаная вышэй тэрміналагічная неадназначнасць зразумелая і дапушчальная.

Тым не менш падобнае вытлумачэнне пытання не павінна прывесці да ўяўлення аб адвольным выкарыстанні разглядаемых паняццяў. Якраз наадварот, найбольш дакладна павінны быць вызначаны межы і сэнсавыя адценні ўжывання апошніх. Так, пры вызначэнні паняцця "народная педагогіка" наўрад ці апраўдана пашырэнне яго зместу за кошт уваядзення туды катэгорый выхаваўчай практычнай дзейнасці. Тым больш што ў навуковым ужытку трывала ўсталяваліся такія тэрміны, як "народнае выхаванне", "народная выхаваўчая сістэма", "народна-выхаваўчы вопыт" і г.д. Хоць у народнай педагогіцы выхаваўчыя ідэі арганічна звязаны з паўсядзённай практыкай, што і падштурхоўвае да іх сумеснага разгляду, аднак размежаванне гэтых катэгорый, бачанне іх рознафункцыянальнасці дапамагаюць больш поўна і глыбока асэнсаваць духоўны феномен народна-педагагічнай культуры. Больш слушнымі ўяўляюцца трактоўкі народнай педагогікі як сукупнасці характэрных для народа ідэй, поглядаў на выхаванне. Пры такім падыходзе адбываецца выдзяленне ў самастойна значныя элементы народнай культуры і педагагічных ведаў, і канкрэтнага выхаваўчага вопыту, якія ўсё ж не заўсёды адэкватна адлюстроўваюць адзін аднаго. Такім чынам значна пашыраецца магчымасць больш глыбокага вывучэння народна-педагагічных набыткаў. Але калі такое размежаванне народна-выхаваўчай "тэорыі" і "практыкі" пры вызначэнні сутнасці народнай педагогікі можна правесці даволі выразна, абгрунтавана і пераканаўча дзякуючы перш за ўсё адназначнасці паняцця "педагогіка", то дакладна акрэсліць межы паняцця "народная" можна толькі ў канкрэтным кантэксце. Бо само паняцце "народ" можа азначаць:

а) усё насельніцтва пэўнай краіны ці рэгіёна;

б) класы і слаі насельніцтва, якія ўяўляюць пераважную большасць грамадства, складаюцца ў асноўным з працоўных мас;

в) розныя формы гістарычных людскіх супольнасцей (племя, род, нацыя).

І тады ў першым выпадку пад народнай педагогікай разумеецца пласт педагагічнай культуры, які існуе адносна самастойна ад афіцыйна распрацаваных навуковых тэорый. Іншымі словамі, народнасць прадугледжвае адмежаванне ад прафесійнай сферы дзейнасці. У другім выпадку разглядаемае паняцце напаўняецца сацыялагічным зместам.

У папярэднія гады сацыялагічны падыход быў не проста дамінуючым, а хутчэй непадзельна пануючым у трактоўцы паняцця "народ". Народ усведамляўся галоўным чынам як працоўныя масы, якія "па свайму становішчу здольны ўдзельнічаць у вырашэнні задач прагрэсіўнага развіцця грамадства" [8, *858*]. Таму і народная педагогіка трактавалася як састаўная частка простанароднай культуры, галоўным чынам сялянскай. Так, хоць разглядаемыя з падобных пазіцый класы і пэўныя саслоўі і з'яўляліся асноўнымі творцамі традыцыйнай культуры (у тым ліку і педагагічнай), але ж трэба прызнаць, што і іншыя сацыяльныя групы ўносілі пэўны ўклад у яе развіццё. Таму разгляд народнай педагогікі з сацыяльна-класавых пазіцый як вынік творчасці ў асноўным працоўных мас апраўданы ў тым сэнсе, што такі падыход вызначае галоўны, дамінуючы ў грамадстве пласт традыцыйна-бытавой педагагічнай культуры.

Трэцяе сэнсавае значэнне паняцця "народ" прыводзіць фактычна да катэгорыі "этнас". І ў гэтым выпадку поўнасцю апраўданы падыход да паняццяў "этнічная педагогіка" і "народная педагогіка" як сінанімічных. Наогул жа, этнічная педагогіка настолькі адрозніваецца ад народнай, наколькі этнас адрозніваецца ад народа. Прычым гэтыя адрозненні, у першую чаргу, трэба шукаць у духоўнай сферы, бытавой культуры, бо менавіта там адбываецца фарманне асобы. Не столькі для доказнасці, колькі для нагляднасці параўнання хацелася б прывесці такі прыклад. У сувязі з тым што розныя этнасы практычна не маюць істотных фізіялагічных адрозненняў, не можа побач з народнай медыцынай існаваць этнічная медыцына. Прыналежнасць народна-медыцынскіх ведаў да пэўнага этнасу можа вызначацца толькі ўкладам гэтага этнасу ў іх распрацоўку (кітайская медыцына, тыбецкая медыцына і г.д.). Выкарыстоўвацца такія ж веды могуць прадстаўнікамі любога этнасу.

Іншая справа з народна-педагагічнымі набыткамі. Асобныя з іх таксама характэрны для людской супольнасці наогул, яны знаходзяць ужытак у розных народаў, маюць характар агульначалавечых каштоўнасцей, уваходзяць у народна-педагагічную культуру і педагагічную навуку. Вывучэнне такіх дасягненняў народна-педагагічнай культуры з этнапедагагічных пазіцый адбываецца, як правіла, з мэтай разгляду іх выкарыстання пэўным этнасам ці ўкладам апошняга ў іх распрацоўку. Ёсць жа і такія народна-педагагічныя набыткі, якія ўласцівы і характэрны толькі для пэўнага этнасу. Яны выпрацаваны апошнім, будуюцца на яго асаблівасцях і не заўсёды прыдатны да выкарыстання іншымі этнасамі. І калі з усёй сукупнасці народна-педагагічнай культуры мы выдзяляем менавіта іх, то да месца

ўжыванне тэрміна "этнапедагогіка", што мае на мэце разгляд этнічнай спецыфікі выхавання і педагагічнай думкі пэўнай этнічнай супольнасці.

Такім чынам, катэгорыі "народная педагогіка" і "этнічная педагогіка" могуць выкарыстоўвацца для абазначэння аднаго і таго ж пласта традыцыйна-бытавой культуры пэўнай людской супольнасці, і ў гэтым выпадку яны практычна супадаюць. А калі патрэбна акцэнтаваць увагу менавіта на ўласна этнічным аспекце педагагічнай культуры, то больш апраўдана выкарыстанне тэрміна "этнапедагогіка". Больш таго, у выпадку, калі творцай такога кампанента з'яўляецца народ, магчыма выкарыстанне абодвух тэрмінаў.

Але ж у стварэнні этнапедагагічнай культуры ўдзельнічаюць і канкрэтныя прадстаўнікі грамадскай і педагагічнай думкі, і тады выкарыстанне тэрміна "народная педагогіка" было б проста няправільным. Значыць, адрозненнем этнічнай педагогікі ад народнай з'яўляецца не толькі скіраванасць першай на этнанацыянальныя асаблівасці пэўнай людской супольнасці, але і дапушчэнне магчымасці ўдзелу ў яе стварэнні канкрэтных асоб, што немагчыма ў народнай педагогіцы. Менавіта апошняя акалічнасць, якая "дазваляе канкрэтным асобам" асэнсоўваць народна-педагагічныя набыткі, дае падставы гаварыць аб этнапедагогіцы як "навуцы аб народнай педагогіцы".

Відавочна, што пры гэтым змест самога паняцця прынцыпова не мяняецца. Бо калі ў першым выпадку змест "этнапедагогікі" складае адпаведны культурны педагагічны пласт, які існуе аб'ектыўна, незалежна ад даследчыкаў, то ў другім — ён прадстаўляецца даследчыкамі як вынік вывучэння імі народна-педагагічнай культуры. Такім чынам, па сутнасці гаворка ідзе аб розных формах захавання адных і тых жа ведаў. Калі ж мы хочам асобна акцэнтаваць увагу на абагульняючых выніках вывучэння этнапедагогікі, то да месца будзе выкарыстанне тэрміна "этнапедагагічная навука". Было б яшчэ больш дакладна навуку, якая даследуе этнапедагагічную культуру, назваць этналагічнай педагогікай (этналагапедагогікай).

Такое разуменне этнічнай педагогікі не супярэчыць азначаным вышэй падыходам, а пашырае сферу яго выкарыстання. Безумоўна, шматзначнасць тэрмінаў, што выкарыстоўваюцца ў любой навуцы, прыводзіць да сур'ёзных цяжкасцей і супярэчнасцей. Бо з дапамогай катэгарыяльна-тэрміналагічнага апарату вызначаюцца адпаведныя паняцці, якія, у сваю чаргу, адлюстроўваюць прадмет даследавання навукі. У рэшце рэшт атрымліваецца недакладная вызначанасць самога прадмета даследавання, што сур'ёзна падрывае асновы тэарэтычных распрацовак. Якраз гэта і назіраецца ў этнапедагагічных даследаваннях. Робяцца спробы даць дэфініцыі пэўных паняццяў у той час, калі не вызначана, які сэнс укладваць у гэтыя паняцці. Як выхад са становішча Н.А.Коршунава прапануе не дапускаць шматзначнасці паняццяў хаця б у межах пэўнага канкрэтнага даследавання [9, *48*]. М.А.Галазуазава і Г.Н.Шцімава слушна адзначаюць, што шматзначным можа быць тэрмін ці слова, але не само паняцце [10, *17*]. Вось чаму ўяўляецца вельмі важным пры распрацоўцы базавых паняццяў этнапедагогікі арыентавацца на агульную сістэму паняццяў педагагічнай навукі наогул. Такі падыход забяспечыць лепшае разуменне ролі і месца этнапедагогікі ў сістэме педагагічнай культуры.

Паміж народнай і навуковай педагогікай існуе цесная сувязь. Не можа

выклікаць сумнення той факт, што педагагічныя веды, якія непасрэдна вынікалі з выхаваўчай практыкі, пачалі абагульняцца, назапашвацца і ўдасканальвацца ў грамадскай свядомасці, народнай мудрасці. Паступова адбываўся працэс зараджэння і развіцця грамадскіх і дзяржаўных выхаваўчых інстытутаў. З выдзяленнем педагагічнай дзейнасці ў самастойны, прафесійны від дзейнасці ўзнікла неабходнасць яго ўдасканалення, што ў рэшце рэшт прывяло да стварэння самастойнай навукі — педагогікі. У сувязі з тым што характар і змест дзяржаўнай адукацыйна-выхаваўчай сістэмы ў значнай ступені вызначаліся запатрабаваннямі правячых класаў і саслоўяў, то і распрацоўка педагагічнай тэорыі не заўсёды ахоплівала інтарэсы ніжэйшых слаёў грамадства. Гэта надавала асаблівы дынамізм развіццю народна-педагагічных ідэй, якія працягвалі сілкаваць навуковыя педагагічныя тэорыі.

Такім чынам, народная педагогіка ўяўляе найважнейшы выток навуковай педагогікі. У ліку яе характэрных адметнасцей можна назваць сінкрэтычнасць, калектыўнасць, дэмакратычнасць, непрафесіянальнасць, традыцыйнасць, шматварыятыўнасць і г.д. У сваю чаргу, ва ўсе часы народная педагогіка плённа засвойвае прафесійныя педагагічныя новаўвядзенні, якія даступны і практычна мэтазгодны для шырокіх слаёў насельніцтва. У якасці прыкладаў можна прывесці адносіны народа да кніжных ведаў, хрысціянскіх духоўных каштоўнасцей, прынцыпаў, метадаў, сродкаў выхавання і інш.

Дарэчы, непераадольнага бар'ера паміж навуковай і народнай педагогікай няма і быць не можа і па іншай прычыне. Бо як дасягненні педагагічнай тэорыі абапіраюцца на шматвяковы выхаваўчы вопыт народа, так і народна-педагагічныя здабыткі ў выглядзе асобных помнікаў традыцыйнай педагагічнай культуры нясуць на сабе адбітак індывідуальнасці свайго творцы і нават распаўсюджвальніка. У рознай ступені, але элемент суб'ектыўнасці закладзены ва ўсіх відах і формах педагагічнай культуры ўжо на самым пачатку іх стварэння. Гэта не змяншае ступені аб'ектывізацыі культурна-педагагічных працэсаў, а дапамагае больш поўна і дэталёва асэнсаваць агульнае і адметнае ва ўсіх праявах духоўнага быцця.

Вельмі важным для навуковай педагагічнай тэорыі з'яўляецца гістарычны аспект. Сцвярджэнне аб тым, што без гісторыі навукі не можа быць і яе тэорыі, яшчэ ў большай ступені тычыцца этнічнай педагогікі. Бо на розных этапах развіцця пэўнага грамадства істотна мяняліся не толькі народна-выхаваўчыя ідэі, але і роля і месца этнічнай культуры ў жыцці народа. Не выпадкова, што Г.Н.Волкаў прапануе вылучыць у якасці самастойнага аб'екта гістарычную этнапедагогіку.

Але ж у адрозненне ад навуковай педагогікі, як слушна адзначае У.М.Конан, этнапедагагічная культура "не паддаецца прынятай у культуралогіі, літаратуразнаўстве і іншых галінах гуманітарнай навукі атрыбутацыі (вызначэнне індывідуальнага альбо калектыўнага аўтарства, даты стварэння і інш.) і храналагічнай перыядызацыі. З пэўнай дакладнасцю можна ўстанавіць толькі дату (год альбо дзесяцігоддзе) фіксацыі помнікаў народнай культуры" [11,9]. Таму размова павінна весціся не столькі аб развіцці этнапедагогікі ў канкрэтныя гістарычныя прамежкі часу, колькі аб гістарычным падыходзе ў асэнсаванні яе ідэй. Хаця храналагічны прынцып даследавання народна-педагагічнай

культуры магчымы і нават неабходны пры ўмове выдзялення адпаведных перыядаў з досыць адноснымі і шырокімі межамі. Такі падыход засцеражэ ад катэгарычных, адназначных ацэнак. Напрыклад, у выпадку несупадзення асобных народна-выхаваўчых поглядаў з сучаснымі ўяўленнямі апошнія адразу ж залічваюцца ў разрад “непрагрэсіўных”, “адмоўных” і “шкодных”. Дарэчы, такое ж адбываецца і ў навуковай педагогіцы. Асобныя яе палажэнні былі непахіснымі і дамінуючымі ў пэўныя перыяды гісторыі грамадства, у іншыя ж яны поўнасцю адвяргаліся.

Хацелася б звярнуць увагу яшчэ на адну акалічнасць. Калі мы разглядаем пытанні народнай педагогікі, то, як правіла, маем на ўвазе іх стан у мінулым. Складваецца ўражанне, быццам бы ў апошнія часы народная педагогіка пастунова перастала выконваць уласцівыя ёй функцыі, а практычныя задачы сацыялізацыі моладзі пачалі вырашаць шматлікія выхаваўчыя інстытуты грамадства, якія ў сваёй дзейнасці кіруюцца палажэннямі педагагічнай навукі, а не эмпірызмам народна-выхаваўчага вопыту. У пэўнай ступені так яно і ёсць. Бо народная педагогіка заўжды адлюстроўвала дасягненні традыцыйна-бытавой культуры побач з афіцыйнай тэорыяй і прафесіянальнай арганізацыяй практыкі выхавання ці ў процівагу ім. У сучасных жа ўмовах у сувязі з радыкальнымі зменамі ў распаўсюджанні інфармаванасці насельніцтва дасягненні педагагічнай навукі даволі хутка ўкараняюцца ў грамадскую свядомасць і становяцца арганічнымі элементамі традыцыйна-бытавой педагагічнай культуры. Сёння больш востра паўстае пытанне аб выкарыстанні шматвяковых набыткаў народнай педагогікі ў арганізацыі выхавання падрастаючых пакаленняў.

Вядома, што ў глыбокай старажытнасці адзінай формай духоўнай, у тым ліку і педагагічнай, культуры была вусная народная творчасць. З цягам часу народна-педагагічная думка папаўнялася за кошт выхаваўчага вопыту стыхійна-эмпірычнымі, практычнымі педагагічнымі ведамі і праяўлялася ў розных формах дзейнасці (працоўнай, рэлігійнай, мастацкай, маральнай і інш.). Педагагічны вопыт народа замацоўваўся і захоўваўся ў шматлікіх звычаях, абрадах, традыцыях, дзіцячых гульнях, цацках і г.д. Дзейснымі выхаваўчымі сродкамі і спосабамі з самых ранніх этапаў развіцця грамадства былі таксама прадукты матэрыяльнай народнай творчасці: ужытковае мастацтва, лад жыцця, удзел у розных відах працы, грамадская думка і інш. Вывучэнне генезісу і эвалюцыі народнай творчасці дае падставы сцвярджаць, што пры ўсёй яе шматграннасці і шматпланавасці жыццёвага ўжытку самае велічнае і пачэснае месца займае яна ў справе выхавання.

Вякамі назапашаная народная мудрасць пасля мастацкага асэнсавання знайшла сваё ўвасабленне ў фальклоры, які з гэтай прычыны з'яўляецца найважнейшым са сховішчаў і сродкаў этнічнай педагогікі. Выкрышталізаваныя ў фальклоры адносіны народа да жыццёвых з'яў, нормы і правілы сацыяльнага быцця, погляды на шляхі, змест і стасункі грамадскага ўладкавання яскрава адлюстроўваюць педагагічную свядомасць пэўнай гістарычнай супольнасці.

У фальклоры з дапамогай высокага ўзроўню апрацоўкі мастацкага слова адлюстраванне рэчаіснасці носіць у параўнанні з літаратурай больш абагульнены характар. У гэтым ён набліжаецца да навукі. Не выпадкова А.М.Горкі лічыў, што фальклорнае багацце “па сваім сэнсе і

прызначэнні з'яўлялася навукай і літаратурай" [12, *235*]. Цесная сувязь фальклорных твораў з рэальным жыццём, ідэалізацыя, узвелічэнне, гіпербалізацыя герояў, розныя віды тыпізацыі рэчаіснасці, напаўненне вуснай народнай творчасці канкрэтным выхаваўчым сэнсам робяць яе каштоўным народна-педагагічным помнікам.

Адным з відаў народнай творчасці з'яўляецца дзіцячы фальклор, які яскрава адлюстроўвае педагагічныя погляды народа, яго клопат аб выхаванні дзяцей. Небеспадстаўным уяўляецца меркаванне, што дзіцячы фальклор быў выкліканы да жыцця амаль што выключна педагагічнымі патрабаваннямі грамадства і складае няпісаную хрэстаматыю па народным выхаванні дзяцей розных узростаў. Ва ўсіх сваіх жанрах — калыханках, забаўлянках, пацешках, дзіцячых песнях, загадках, гульнях, лічылках, казках і г.д. — ён з дыдактычнай лапідарнасцю выконваў і выконвае важныя выхаваўчыя задачы. Забяспечваючы непарыўнасць працэсу сацыяльнай пераемнасці, ён узбагачае выхаваўчую скіраванасць пазнавальнай, эстэтычнай, камунікатыўнай функцыямі і таму становіцца важнай састаўной часткай духоўнай культуры народа. Ён больш чым іншыя віды народнай творчасці захоўвае ў першастворaным стане як змястоўнае напаўненне, так і поліфункцыянальную прызначанасць сваіх жанраў.

Падсумоўваючы вышэйсказанае, можна сцвярджаць, што, нягледзячы на нявырашанасць многіх пытанняў па даследаванні этнапедагагічнай культуры, сёння пераканаўча даказана неабходнасць выкарыстання яе набыткаў як пры распрацоўцы педагагічнай тэорыі, так і пры практычнай арганізацыі выхаваўчых працэсаў. Этнапедагагічныя ідэі з'яўляюцца той жыватворнай крыніцай, якая сілкуе сацыяльна-духоўную ауру пэўнай гістарычнай людской супольнасці і перашкаджае ператварэнню народа ў бязлікае насельніцтва. З другога боку, менавіта этнапедагогіка дапамагае ўзняцца да вяршынь агульначалавечых маральна-духоўных каштоўнасцей, якія, у сваю чаргу, узялі ўсё лепшае з этнічных скарбніц кожнага народа. Таму толькі праз этнапедагогіку можна пракласці шлях да агульнапланетарнай педагагічнай культуры.

1. *Ушинский К.Д.* Педагогические сочинения. — М.; Л.: Изд-во АПН, 1948. — Т.2. — 656 с.
2. *Виноградов Г.С.* Народная педагогика. — Иркутск: Вост.-Сибирск. отд. Русск. географ. об-ва, 1926. — 30 с.
3. *Гашимов А.Ш.* Идеи умственного и нравственного воспитания в азейбарджанских сказках и пословицах: Автореф. дис. ... канд. пед.наук. — Баку: Азербайдж. НИИ педагогики, 1957. — 20 с.
4. *Намитоков Ю.П.* Адыгейская народная педагогика о воспитании детей // Сборник статей кафедры педагогики и психологии Адыгейского педагогического института. — Майкоп, 1957. — С. 46—58.
5. *Волков Г.Н.* Этнопедагогика. — Чебоксары: Чувашск. книжн. изд-во, 1974. — 376 с.
6. *Комарова Г.А.* О понятии "этнопедагогика" в советской этнографической и педагогической науке // Изучение преемственности этнокультурных явлений. — М., 1980. — С. 202—212.
7. *Христова Е.Л.* Об уточнении понятийного аппарата этнопедагогики // Советская педагогика. — 1989. — № 7. — С. 103—106.
8. Советский энциклопедический словарь / Гл.ред. А.П.Прохоров. — 3-е изд. — М.: Сов. энциклопедия, 1985. — 1600 с.
9. *Коршунова Н.Л.* Зачем нужна однозначность научных понятий // Советская педагогика. — 1992. — № 3—4. — С.48—52.
10. *Галозузова М.А., Штимова Г.Н.* Понятийно-терминологические проблемы педагогики и образования // Педагогика. — 1997. — № 6. — С. 15—20.
11. Народная педагогіка беларусаў / Конан У.М., Болбас В.С., Ляута П.І. і інш. — Мінск: НІА, 1996. — 166 с.
12. Архив А.М.Горького. — М.,1951. — Т. 3. — 298 с.
13. *Ханбиков Я.И.* Народная педагогика // Педагогическая энциклопедия. — М., 1966. — Т.3. — С. 35—36.